*С. В. Мяньчэня*
Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка імя І. С. Лупіновіча Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;
Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, Мінск

*S. V. Mianchenya*
I. S. Lupinovich Belarus Agricultural Library of the National Academy of Sciences of Belarus;
Belarusian State Agrarian Technical University, Minsk

**УДК 070.48:63:001.92"1906-1915"**

# ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ВЕДАЎ І АЦЭНКА СТАНУ І ПЕРСПЕКТЫЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСІ НА СТАРОНКАХ «НАШАЙ НІВЫ» (1906–1915 ГГ.)

# PROMOTION OF AGRICULTURAL KNOWLEDGE AND ASSESSMENT OF THE STATE AND PROSPECTS OF THE BELARUSIAN AGRICULTURE ON THE PAGES OF «NASHA NIVA» (1906–1915)

*Артыкул прысвечаны дзейнасці газеты «Наша Ніва», накіраванай на папулярызацыю і распаўсюджванне сельскагаспадарчых ведаў у 1906–1915 гг. Аналізуюцца разнастайныя формы падачы інфармацыі, перыядычнасць, змест матэрыялаў, выдавецкая дзейнасць рэдакцыі, удзел яе ў сельскагаспадарчых выставах. Пашырэнне сельскагаспадарчых ведаў і перайманне новых тэхналогій гаспадарання павінны былі павысіць матэрыяльны ўзровень жыцця сялян і стаць эканамічнай асновай беларускага нацыянальнага Адраджэння.*
*Ключавыя словы: «Наша Ніва»; сельская гаспадарка; сельскагаспадарчыя веды; кааперацыя; хутарская гаспадарка.*

*The article is devoted to the activities of the newspaper "Nasha Niva" aimed at the popularization and dissemination of agricultural knowledge in 1906–1915. Various forms of information submission, periodicity, content of materials, publishing activities of the editorial office, its participation in agricultural exhibitions are analyzed. The distribution of agricultural knowledge and the adoption of new farming technologies were supposed to raise the material standard of living of the peasants and become the economic basis of the Belarusian national Renaissance.*
*Key words: "Nasha Niva"; agriculture; agricultural knowledge; cooperation; farm.*

Тэма сельскай гаспадаркі мела важнае значэнне для аўтараў-выдаўцоў «Нашай Нівы», бо яны разглядалі сялянства, як сваю мэтавую аўдыторыю і сацыяльную базу беларускага Адраджэння, а сялянскі дабрабыт – як эканамічны падмурак краю [1, с. 60]. З гэтай нагоды на старонках газеты размяшчаліся разнастайныя матэрыялы, прысвечаныя аграрнай палітыцы ўлад, новым сельскагаспадарчым тэхналогіям, аграрнай адукацыі, замежнаму вопыту вядзення гаспадаркі.

Першыя матэрыялы «Нашай Нівы», прысвечаныя сельскай гаспадарцы, не былі сістэматызаваны і з'яўляліся асобнымі невялікімі артыкуламі на розную тэматыку. Сярод іх аўтараў трэба адзначыць Вацлава Іваноўскага (псеўданім – Вацюк Тройца) і Юрыя Булгака (Бусел з-пад Слуцка) [2; 3]. В. Іваноўскі актыўна супрацоўнічаў у гэты час з «Нашай Нівай», негледзячы на стажыроўку за мяжой. У яго артыкулах даюцца практычныя рэкамендацыі па апрацоўцы глебы, інфармацыя аб дзейнасці сельскагаспадарчай суполкі ў Банюках (сёння вёска ў Шчучынскім раёне) (№ 2, 1907). У пачатку 1908 г. ён публікуе чатыры гутаркі «Цукер», у якіх былі падрабязна апісаны гісторыя цукраварэння ў Беларусі, тэхналогія вырабу і ачысткі цукру [4]. Пазней гутаркі былі аб'яднаны і выйшлі асобным выданнем. «Дзесяць запаведзей для вясковага гаспадара» Бусла з-пад Слуцка ўтрымлівалі кароткія парады: «якім зярном пасееш, такі і колас будзе; не заворвай гной глыбока і ў мокрую зямлю; часцей бярыся за барану, менш гартай зямлю плугам» [3]. Яны прыйшліся да спадобы і чытачам, і рэдакцыі. У звароце да аўтара рэдакцыя раіла: «старайцеся трымацца такога спосабу напісання: вялікія рэчы слаба чытаюць, а такіх наказаў больш слухаюць і помняць добра» [5, с. 8].

З № 25 1907 г. у газеце з'яўляецца асобная рубрыка «Рада для гаспадароў». Тут размяшчаліся невялікія парады па розных пытаннях гаспадаркі, асобнага загалоўка яны часта не мелі, у некаторых выпадках не пазначаўся і аўтар. Першапачаткова выходзіла яна спарадычна – па 2 разы ў 1907, 1908 і 1909 гг. (№№ 25 і 28; №№ 11, 18; №№ 39, 40). У 1910 г. яна сустракаецца ў 15 нумарах, у 1911 г. – у 19, у 1912 – у 3. З пачаткам выдання А. Уласавым асобнага сельскагаспадарчага часопіса «Саха» (красавік 1912 г.) рубрыка знікае. Выданне «Сахі» паўплывала і на змест сельскагаспадарчых матэрыялаў у «Нашай Ніве» – газета засяродзілася на эканамічных пытаннях вядзення гаспадаркі, аграрнай адукацыі і рэкламе.

Вялікі попыт на сельскагаспадарчыя матэрыялы з боку чытачоў і абмежаваны аб'ём газеты прымусілі рэдакцыю шукаць выйсце ў выпуску асобных спецыялізаваных выданняў. У № 22 за 1908 г. у раздзеле «Паштовая скрынка» у адказ на ліст чытача з Барысава адзначалася: «…кажаце, што мала пішам пра сельскую гаспадарку. Гэта праўда! Пішам колькі можам, толькі месца мала»; далей паведамлялася пра план выдання сельскагаспадарчага каляндара [6, с. 8]. Аднак ажыццявіць гэты план атрымалася толькі праз год. Яшчэ адной формай распаўсюджвання сельскагаспадарчых ведаў сталі брашуры. У 1911 г. «Наша Ніва» прапаноўвала 5 брашур, што ўтрымлівалі раней надрукаваныя ў ёй матэрыялы: «Гутаркі аб гаспадарцы», «Зямельная справа ў Новай Зеландыі», «Як рабіць добрыя рамавыя вуллі», «Аб гаспадарцы на хутары і шнурах» і «Як ужываць штучны навоз». Першыя чатыры былі ў кірылічным і лацінскім варыянце, апошняе – толькі ў кірылічным. Кошт выданняў вагаўся ад 2 да 5 кап. [7, с. 4].

Па змесце матэрыялы «Нашай Нівы» на сельскагаспадарчую тэматыку можна падзяліць на наступныя групы: практычныя парады; новыя тэхнало-

гіі і замежны вопыт; эканамічныя пытанні; папулярызацыя сельскагаспадарчых ведаў і аграрная адукацыя.

Практычныя парады датычыліся ў асноўным методыкі апрацоўкі глебы і пасадкі сельскагаспадарчых культур, жывёлагадоўлі, садаводства, будаўніцтва і пчалярства. Сярод земляробчых парад вылучаліся пытанні паляпшэння сенажацяў і барацьбы з празмернай вільготнасцю глебы, рэкамендацыі па даглядзе за бульбай і карысць ад кармавых культур (лубіна, «бульвы» – тапінамбура, гароху, кармовой морквы). Значная ўвага надавалася свінагадоўлі і малочнай гаспадарцы. Свінагадоўля, на думку сталага аўтара «Нашай Нівы» агранома М. Б. (сустракаюцца таксама наступныя варыянты подпісу: М. Б-н, М. Смаргонскі), магла стаць эканамічнай асновай сельскай гаспадаркі Беларусі. Для гэтага меліся і пэўныя падставы. Так, у Магілёўскай, Мінскай і Віленскай губернях на 1000 чал. прыходзілася 240 свіней, тады як сярэдні паказчык па Расійскай імперыі складаў 122. Развіццю свінагадоўлі ў Беларусі павінна была паспрыяць пашырэнне пасеваў бульбы і ячменя [8]. Сярод праблем свінагадоўлі і аўтары, і чытачы «Нашай Нівы» адзначалі хваробы, перш за ўсё «рожа карбункулавая», і паразітаў. Для барацьбы з рожай рэдакцыя ў адказе на ліст чытача Тамаша з Горлікаў рэкамендавала хутчэй звярнуцца да ветэрынара і зрабіць прышчэпку, а пры адсутнасці такой магчымасці – забіць жывёлу на стадыі пачатку хваробы, пакуль мяса не стала шкодным для людзей [9, с. 8]. Яшчэ аднаму чытачу – Я. Разоры з Дзісны – рэдакцыя раіла не давяраць загаварам ведуноў, а ўсё ж зрабіць свінні прышчэпку, спасылаючыся на вопыт Чэхіі, дзе ў 1907 г. было прышчэплена 37 910 свіней [10, с. 8]. У 1910 г. быў апублікаваны артыкул з малюнкамі «Трыхіны і солітэр» аб забруджанасці свінога мяса трыхінілёзам і саліцёрамі, яго шкоднасці і спосабах пазбегнуць заражэння [11].

Перспектыўнай галіной гаспадаркі ва ўмовах пашырэння хутароў лічылася пчалярства. У артыкуле К. Барысовіча «Гутарка аб пчолах» (1910, № 1) даваліся парады аб тым, як расстаўляць вуллі, уцяпляць іх зімой, ратаваць пчол ад мышэй [12]. У наступных двух нумарах выйшла публікацыя «Як рабіць добрыя рамавыя вуллі», якая, як адзначалася вышэй, стала затым асобным выданнем. Для пчаляроў публікаваліся спісы спецыялізаванай літаратуры, а ў самой рэдакцыі можна было набыць выданне «Пчаліна – жывёлка малая, а карысці дае многа», што выйшла ў 1911 г. у Пецярбургу беларускай лацінкай пад аўтарствам ксяндза Генрыка Бэты (псеўданім – H. Bierozko) [13, с. 3].

З практычнымі парадамі вядзення гаспадаркі цесна звязана інфармацыя аб новых тэхналогіях і тэхніцы. «Наша Ніва» распавядала чытачам аб прымяненні ў гаспадарцы спрынжыновак, дыскавых барон, бараны для выдзірання моху. З 1907 г. у газеце стала прысутнічае рэклама склада сельскагаспадарчых машын Зыгмунда Нагродзкага з Вільні. У красавіку 1912 г. рэдакцыя зрабіла рассылку сваім чытачам каталога прадукцыі Нагродзкага

разам з першым нумарам часопіса «Саха» [14, с. 4]. У 1913 г. рэкламавалася бульбакапалка Судакова з Арлоўскай губерні, пры гэтым пакупнікам абяцалі вярнуць грошы, калі прылада ім не спадабаецца [15, с. 4]. Улічваючы мяса-малочную спецыялізацыю сельскай гаспадаркі рэгіёна, не заставалася без увагі і гэта галіна вытворчасці. Для вытворцаў малочнай прадукцыі прапаноўваўся малочны сепаратар «Дыябола» (1913, № 6). Падчас вайны ў 1915 г. «Наша Ніва» паведамляла аб перадачы на склад Віленскага сельскагаспадарчага таварыства тэхнікі, вывезенай з Усходняй Прусіі, коштам амаль на 500 тыс. руб., і аб планах раздаць яе пацярпелым ад вайны жыхарам Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай і Сувалкскай губерняў [16, с. 4].

Вялікая ўвага надавалася выкарыстанню ўгнаенняў – як арганічных, так і мінеральных («штучны гной»). З першай групы вылучаліся торф («Торф у сельскай гаспадарцы», 1908, № 10), кампост, попел і птушыны гной. Аўтар Тутэйшы раіў для ўгнаення глебы зрабіць прыбіральню тым гаспадарам, у якіх яе яшчэ не было [17]. Сярод мінеральных угнаенняў рэкамендавалася выкарыстоўваць суперфасфат, томас-шлак, каініт, калійную соль, салетру і вапну. Асаблівасці выкарыстання гэтых угнаенняў разглядаліся ў раздзеле «Рады для гаспадароў» (1910, №№ 30–32). У 1909 г. была апублікавана справаздача аб вопытах з аўсом і жытам у в. Астрамечава (суч. – Брэсцкі раён). Для вопыта палі былі падзелены на шэсць частак, для кожнай з іх выкарыстоўваліся розныя ўгнаенні і іх спалучэнні. Аднак, калі ўраджайнасць аўса атрымалася прааналізаваць, то з жытам эксперымент скончыўся няўдала – нехта скраў з поля снапы [18]. Зладзіць падобны эксперымент чытачы «Нашай Нівы» маглі і самастойна. Жадаючыя павінны былі адаслаць у рэдакцыю паштоўку са зваротным адрасам, і тады ім адсылалі 10 фунтаў (каля 4,5 кг) угнаенняў і інструкцыю па іх выкарыстанні бясплатна [19, с. 4].

Замежны вопыт гаспадарання быў прадстаўлены шэрагам артукулаў сацыяльна-эканамічнага характару: «Законы аб арандатарах-мужыках у Індыі» (1907, № 7), «Зямельная справа ў Новай Зеландыі» (1907, № 8), «Закон аб дробных зямельных гаспадарках у Англіі» (1907, № 20), «Вясковыя таварыствы ў Гішпаніі» (1909, № 49), «Нямецкі сельскі парабак» (1910, № 35). За артыкул «Зямельная справа ў Новай Зеландыі» разам з фельетонам «Дума і народ» на адзначаны нумар віленскім інспектарам па справах друку быў накладзены арышт [1, Дело IV отделения канцелярии Главного Управления по делам печати. По издании в гор. Вильно газеты «Наша ніва» (1906–1915 гг.), арк. 3]. У артыкуле разглядалася падаткавая сістэма Новай Зеландыі, палітыка ўрада па выкупе латыфундый і арэндная практыка для дробных гаспадароў. Паляпшэнне становішча сялян звязвалася з увядзеннем аўтаноміі і стварэннем выбарных органаў самакіравання [20]. У самім нумары аўтар не быў пазначаны, толькі давалася спасылка на пераклад з украінскай мовы. Пазней «Зямельная справа…» выйшла асобным выданнем – у лацінскім і кірылічным варыянце – коштам па 3 кап. Тут аўтарам-перакладчыкам быў пазначаны А. Б. [6, с. 8]. У артыкуле «Нямецкі сельскі

парабак» А. Уласаў параўнаў узровень даходаў, выдаткі і рацыён нямецкага сельскага наёмнага рабочага і гаспадароў в. Мігаўка Вілейскага павета. Атрымлівалася, што першы меў чысты гадавы прыбытак амаль у чатыры разы больш за беларускіх сялян [21]. Дабрабыт галандскіх сялян тлумачыўся тым, што «там парадкі ў гаспадарстве надта добрыя, і ўсе мужыкі вучоныя» [22].

Для беларускіх сялян шлях да дабрабыту, ва умовах адсутнасці рэальнай магчымасці паўплываць на дзяржаўную палітыку і недасканаласці зямельнага заканадаўства, бачыўся праз кааперацыю і адукацыю. «Наша Ніва» прапагандавала ідэю сялянскай кааперацыі, сярод форм якой вылучаліся сельскагаспадарчыя гурткі, хаўрусныя крамы, крэдытныя хаўрусы і пазыкова-ашчадныя касы. «Наша Ніва» сачыла за дзейнасцю сельскагаспадарчых гурткоў (Банюкоўскі Лідскага павета, Ухвішчанскі Лепельскага павета і інш.), асвятляла стварэнне новых аб’яднанняў, перавагі кааператыўнай гаспадаркі над індывідуальнай (магчымасць набыцця тэхнікі і пародзістых жывёл, сумесная рэалізацыя прадукцыі). У артыкуле «Сельска-гаспадарскіе хаўрусы» давалася падрабязная інструкцыя па стварэнні гуртка: асаблівасці статута, неабходная колькасць падпісантаў, памер узносаў [23].

Паспяховасць кааперацыі залежыла ад самаарганізацыі саміх сялян, якія павінны былі самі адказваць за свой лёс і не чакаць рэформаў зверху [1, с. 57]. З гэтай прычыны падтрымлівалася і ідэя распаўсюджвання хутарскіх гаспадарак, якія часам называлі «фальварковымі». У 1908 г. «Наша Ніва» пісала аб дзейнасці Зыгмунда Трускаляцкага, які праводзіў гутаркі з сялянамі аб перавагах хутароў і сельскагаспадарчых гурткоў, арганізаваў паездку сялян ва ўзорныя хутарскія гаспадаркі і выдзяліў чатыры дзесяціны сваёй зямлі пад узорны хутар, куды на тры гады запрасіў селяніна Язэпа Цытку, у якога быў раўназначны зямельны надзел, але падзелены на шнуры. Праз тры гады на хутар павінны быў прыйсці новы гаспадар, але Трускаляцкі не дачакаўся вынікаў эксперымента, бо заўчасна памёр ва ўзросце 45 гадоў [24, с. 5]. Даныя ўзорнага хутара і шнуравой гаспадаркі былі прааналізаваны А. Уласавым і ляглі ў аснову асобнага нумара «Нашай Нівы» «Паказальны хутар “Бабоўня”» (суч. – в. Бабоўня, Капыльскі раён). Тут падаваліся падрабязныя планы будынкаў, поля і змены сельскагаспадарчых культур, ураджайнасць, колькасць свойскай жывёлы, яе рацыён, даходы і выдаткі; параўноўваўся фінансавы бок вядзення хутарской і шнуравой гаспадаркі Цыткі за тры гады [25].

Для папуляразацыі хутароў друкаваліся водгукі саміх сялян. Так, напрыклад, сяляне Наваградскага павета адзначалі, што да былой сістэмы «нават за грошы не вернуцца» [26, с. 2]. Меліся таксама аб’явы аб продажы зямлі для хутароў (1913, № 48; 1914, № 2).

Пашырэнне хутароў, на думку рэдакцыі, магло паспрыяць скараненню п’янства, як адной з прычын «цёмнасці» і беднасці сялян: «Каб гарэлку піць зракліся, з вёсак на хутары разышліся, тады роўнае права слабы меў бы

з дужым: не пасвіў бы каня на чужым, кожны сеяў бы кармавыя травы, не рабіў бы другому шкоды ні патравы…» [27]. Такія выпадкі рэальна мелі месца. Пасля адыходу на хутары жыхароў в. Шчажэры (суч. – в. Шчажэр-1 і Шчажэр-2, Магілёўскі раён) мясцовая казённая «вінная крама» не стала мець прыбыткаў [28].

Наладжванне гаспадаркі павінна было вырашыць яшчэ адну праблему – працоўную міграцыю ў Амерыку. Так, у 1912 г. праз порт у Лібаве (суч. – Ліепая, Латвія) у Амерыку выехала 58 507 чал., з іх 21 791 (37 %) – жыхары Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў. У найбольшай ступені эміграцыя закранула Гродзеншчыну (7018 чалавек, ці 12 % ад агульнай колькасці мігрантаў) і Міншчыну (8320, ці 14 %), але, улічваючы розніцу ў памерах і колькасці насельніцтва, маштаб гэтай з’явы ў Гродзенскай губерні падаецца большым [29, с. 2]. Адзначалася, што людзі, якія едуць на заробкі, адвыкаюць ад гаспадаркі і сям’і, не цэняць грошы, хутка іх марнуюць па прыездзе і ад’язджаюць зноў [30, с. 4].

«Наша Ніва», якая сама з’яўлялася адукацыйным суб’ектам, сачыла за станам адукацыйнай сістэмы у галіне сельскай гаспадаркі. У газеце друкавалася інфармацыя аб сельскагаспадарчых установах (Варанецкая ніжэйшая школа, Нова-Александрыйскі інстытут сельскай гаспадаркі і лесаводства, Горацкія вучэбныя ўстановы) і іх выпускніках. Была наладжана сувязь з Секцыяй аграномаў Беларускага краю, якую арганізавалі студэнты ў Нова-Александрыі пад кіраўніцтвам вышэй згаданага М. Б. [31, с. 3]. Паведамлялася пра адкрыццё новых сельскагаспадарчых школ, ахвяраванне для іх зямлі; адсочвалася сітуацыя вакол стварэння ў Мінску сельскагаспадарчага інстытута. Так, у 1913 г. разглядаліся варынты стварэння новай установы, ці пераносу ў Мінск Нова-Александрыйскага інстытута [32, с. 3]. Аднак, ні адзін з іх рэалізаваць з пачаткам Першай сусветнай вайны не атрымалася.

Прапагандаваліся кароткатэрміновыя сельскагаспадарчыя курсы. Пры гэтым інфармацыя «Нашай Нівы» дазваляе скласці графік іх правядзення і вызначыць найбольш папулярную тэматыку. Акрамя агульнаадукацыйных курсаў, на якіх разглядаліся розныя аспекты вядзення гаспадаркі найбольш пашыраны былі курсы малочнай гаспадаркі і жывёлагадоўлі, што было абумоўлена гаспадарчай спецыялізацыяй рэгіёна. У № 3 за 1914 г. змешчана падрабязная справаздача аб курсах малочнай гаспадаркі ў маёнтку Сакалоўшчына Лідскага павета з 1 лістапада 1913 г. па 1 лютага 1914 г. Курсы скончылі 19 слухачоў, з якіх было 12 хлопцаў, 6 дзяўчын і адзін чалавек сталага ўзросту. У Віленскай губерні у сувязі з актыўным развіццём садаводства ў 1913 г. праводзіліся таксама курсы сушэння фруктаў (5–13 сакавіка) [33, с. 4], пчалярства і садаводства (1–15 жніўня і з 1 лістапада да 12 снежня) [34, с. 4].

Яшчэ адной формай пашырэння сельскагаспадарчых ведаў з’яўляліся выставы. Як і ў сітуацыі з курсамі, «Наша Ніва» друкавала аб’явы аб іх правядзенні і справаздачы аб выніках. Аднак гэтым справа не абмяжоўва-

лася: рэдакцыя і сама з'яўлялася актыўным удзельнікам некаторых выстаў. У жніўні 1911 г. у Капылі пры ўдзеле «Нашай Нівы» падчас выставы былі арганізаваны чытанні на беларускай мове на тэму «Як выбраць добрага каня, карову, як даглядаць іх і карміць» [35, с. 3]. У тым жа годзе «Наша Ніва» арганізавала беларускую секцыю на выставе ў Быхаве, на якой атрымала вялікі срэбраны медаль за «Беларускі каляндар». У маі 1913 г. на выставах у м. Гарадок Вілейскага павета і ў Глыбокім былі таксама арганізаваны беларускія аддзелы і продаж календароў. У Гарадку наведвальнікам раздаваліся некаторыя нумары «Нашай Нівы» і «Сахі», у Глыбокім – брашуры «Як ужываць штучны навоз», «Як ратаваць уздутую жывёлу» і «Як рабіць добрыя рамавыя вуллі» агульнай колькасцю 3 000 асобнікаў [36, с. 2; 37, с. 3–4].

Такім чынам, «Наша Ніва» з'яўлялася актыўным праваднікам ідэі пашырэння сельскагаспадарчых ведаў і пераймання новых тэхналогій гаспадарання, што павінна было павысіць матэрыяльны ўзровень жыцця сялян і стаць эканамічнай асновай беларускага нацыянальнага Адраджэння. Рэдакцыяй выкарыстоўваліся розныя формы падачы інфармацыі, што павінна было зрабіць сельскагаспадарчыя веды даступнымі для грамадскасці і спрыяць іх укараненню ў жыццё. Гаспадарчыя парады «Нашай Нівы» датычыліся розных сфер: ад пчалярства і ветэрынарыі, да апрацоўкі глебы і выкарыстання ўгнаенняў. У сваю чаргу, будучыня сельскай гаспадаркі Беларусі бачылася аўтарам «Нашай Нівы» ў развіцці сялянскай кааперацыі, пашырэнні асветы і хутарскіх гаспадарак. Хутарызацыя і кааперацыя не супярэчылі адно аднаму. Першая павінна была павысіць ініцыятыўнасць сялян, спрыяць развіццю жывёлагадоўлі і пчалярства; другая – забяспечыць сялянскія гаспадаркі сельскагаспадарчай тэхнікай і ўгнаеннямі, гарантаваць фінансавую дапамогу, стварыць умовы для рэалізацыі прадукцыі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Унучак, А. У.* «Наша ніва» і беларускі нацыянальны рух (1906–1915 гг.) / А. У. Унучак. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – 186 с.
2. *Тройца, В.* Як правіць сенажаць / В. Тройца // Наша Ніва. – 1906. – № 5, 6, 7.
3. Бусел с-пад Слуцка. Дзесяць запаведзей для вясковага гаспадара // Наша Ніва. – 1907. – № 22. – С. 8.
4. *Тройца, В.* Цукер (з гутарак з дзядзькам Сымонам) / В. Тройца // Наша Ніва. – 1908. – № 4. – С. 4–5; № 5. – С. 5–6; № 6. – С. 5–6; № 7. – С. 5–6.
5. Наша Ніва. – 1907. – № 24.
6. Наша Ніва. – 1908. – № 22.
7. Наша Ніва. – 1911. – № 23.
8. *М. Б.* Эканамічная апора нашага краю / М. Б. // Наша Ніва. – 1913. – № 49. – С. 1–2.
9. Наша Ніва. – 1907. – № 2.
10. Наша Ніва. – 1908. – № 24.
11. *Буда, І.* Трыхіны і солітэр / І. Буда // Наша Ніва. – 1910. – № 5. – С. 3.
12. *Барысовіч, К.* Гутарка аб пчолах / К. Барысовіч // Наша Ніва. – 1910 – № 1. – С. 2.
13. Наша Ніва. – 1912. – № 3.
14. Наша Ніва. – 1912. – № 11–12.

15. Наша Ніва. – 1913. – № 24–25.
16. Наша Ніва. – 1915. – № 14.
17. *Тутэйшы.* Як можна мець болей гною у гаспадарцы / Тутэйшы // Наша Ніва. – 1910. – № 13. – С. 3.
18. *Nemo.* Пробы штучнага гною / Nemo // Наша Ніва. – 1909. – № 46. – С. 3.
19. Наша Ніва. – 1913. – № 15.
20. Зямельная справа ў Новай Зеландыі // Наша Ніва. – 1907. – № 8. – С. 6–8.
21. *А. У.* Нямецкі сельскі парабак / А. У. // Наша Ніва. – 1910. – № 35. – С. 3.
22. Сельскія палі ў Галандыі на беразі мора // Наша Ніва. – 1906. – № 7. – С. 5.
23. *Шкленнік, А.* Сельска-гаспадарскіе хаўрусы (кружкі) / А. Шкленнік // Наша Ніва. – 1912. – № 48. – С. 2.
24. Наша Ніва. – 1908. – № 25.
25. Паказальны хутар «Бабоўня» // Наша Ніва. – 1909. – № 6–7.
26. Наша Ніва. – 1913. – № 38.
27. *Перэкладка.* Дзісненскі павет Іодзская воласць / Перэкладка // Наша Ніва. – 1911. – № 21. – С. 3.
28. і-м-і. Карысная работа / і-м-і // Наша Ніва. – 1912. – № 41. – С. 3.
29. Наша Ніва. – 1913. – № 43.
30. Наша Ніва. – 1913. – № 16–17.
31. Наша Ніва. – 1911. – № 4.
32. Наша Ніва. – 1913. – № 47.
33. Наша Ніва. – 1913. – № 8.
34. Наша Ніва. – 1913. – № 28.
35. Наша Ніва. – 1911. – № 34.
36. Наша Ніва. – 1913. – № 19.
37. Наша Ніва. – 1913. – № 21.

**(Дата падачы: 10.02.2023 г.)**

*Д. В. Низович*
Республиканский институт высшей школы, Минск

*D. V. Nizovich*
National Institute for Higher Education, Minsk

**УДК 322.22 (34.047)**

# ПРАВОВОЕ ПОЛОЖЕНИЕ ПРАВОСЛАВНОЙ ЦЕРКВИ В БЕЛАРУСИ НА РУБЕЖЕ 1980–1990-Х ГГ.

# LEGAL STATUS OF THE ORTHODOX CHURCH IN BELARUS AT THE TURN OF THE 1980S – 1990S

*В статье проводится сравнительный анализ правового статуса Православной церкви в период перестройки и становления белорусской государственности. Рассмотрен процесс формирования новой системы государственно-церковных отношений. Определено, что деятельность Церкви играет важное значение в возрождении духовно-нравственных традиций белорусского народа. Установлены причины и концептуальная основа выбора государством Православной церкви в качестве социального партнера.*